Created in Master PDF Editor - Demo Version

11-17

ISSN 2224-798X

# ГІСТОРЫЯ і грамадазнаўства

серыя «У ДАПАМОГУ ПЕДАГОГУ»

НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫ ЧАСОПІС

№11 (77)/2017
Лістапад

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ








Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

# ГІСТОРЫЯ
## і грамадазнаўства

### НАВУКОВЫЯ І АДУКАЦЫЙНЫЯ ВЕДЫ


3 **Онуприенко С. П.** Психолого-оппозиционные факторы в динамике формирования эколого-культурных ценностей белорусской школьной молодёжи

14 **Врублеўскі Ю. У.** Гістарычныя канцэпцыі ўзнікнення і развіцця гарадоў на беларускіх землях у IX—XVIII стагоддзях


### ШЛЯХІ Ў НАВУКУ


20 **Тынкович Н. С.** Внеурочная деятельность как средство повышения познавательной активности учащихся по истории


### АРГАНІЗАЦЫЯ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ


26 **Шилова Е. С., Руцкая Л. А.** Технология реализации интерактивного метода обучения «Логическая цепочка» на уроках истории: развиваем мышление школьников

32 **Примакова-Пинчук К. Г.** Роль общения в жизни людей. Обществоведение, IX класс

37 **Бондарева А. А.** Основные направления социально-экономического развития. История Беларуси, XI класс (апрель, IV четверть)

42 **Щербакова Е. В.** Формирование умений работы с учебной исторической картой при изучении истории средних веков в VI классе


### ВЫХАВАННЕ ГІСТОРЫЯЙ


45 **Остапченя А. С.** Осознавая прошлое, мы строим будущее. Проект

53 **Козел Даниил.** Хроника исчезающих деревень: в поисках утраченного


### ПАЗАКЛАСНАЯ РАБОТА


60 **Сталович Т. О.** Историческая викторина для учащихся X класса

66 **Волкидович Н. Д.** Оправдание Гефеста. Внеклассное мероприятие по истории Древнего мира, V—VI классы


**На першай старонцы вокладкі** — капліца, пабудаваная ў сувязі з адменай прыгоннага права ў 1861 г., у вёсцы Мядзведзічы (Ляхавіцкі раён). Фота — Н. І. Бобка.

Дасылаючы матэрыялы для публікацыі ў нашым часопісе, аўтары тым самым перадаюць выдаўцу невыключныя маёмасныя правы на ўзнаўленне, распаўсюджванне, паведамленне для ўсеагульнага ведама і іншыя магчымыя спосабы выкарыстання твора без абмежавання тэрыторыі распаўсюджвання (у тым ліку ў электроннай версіі часопіса).

Рэдактар *Л. В. Саламаха*, карэктар *Л. М. Сцяпанава*, камп'ютарны набор і вёрстка *М. В. Даніленка*.

Выхад у свет 29.11.2017.
Фармат 60 × 84 1/8. Друк афсетны. Папера афсетная.
Ум. друк. арк. 7,9. Ул.-выд. арк. 8,4.
Тыраж 572 экз. Заказ 154. Цана свабодная.

Адрас рэдакцыі часопіса «Гісторыя і грамадазнаўства»:
вул. Будзённага, 21, 220070, г. Мінск; тэл. 297-93-20.

Надрукавана ў друкарні Таварыства з абмежаванай адказнасцю «СУГАРТ».
ЛП № 02330/427 ад 17.12.2012.
Вул. Валгаградская, 6, корп. 2, каб. 287, 220012, г. Мінск.
© РУП «Выдавецтва "Адукацыя і выхаванне"», 2017
© Вокладка. К. К. Шастоўскі, В. К. Жалудкова, 2017

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

# Гістарычныя канцэпцыі ўзнікнення і развіцця гарадоў на беларускіх землях у IX—XVIII стагоддзях

**Ю. У. Врублеўскі**, кандыдат гістарычных навук,
загадчык кафедры сацыяльнай работы БДПУ

Матэрыялы прапануемага артыкула могуць паслужыць метадычным падмуркам, які будзе садзейнічаць павышэнню эфектыўнасці ўрока гісторыі ў сярэдняй школе. Вядома, што важнай мэтай гістарычнай адукацыі з'яўляецца засваенне вучнямі асноўных факталагічных і тэарэтычных ведаў пра найважнейшыя падзеі, з'явы, працэсы, тэндэнцыі, заканамернасці развіцця грамадства. Складаным з пункту гледжання метадычнага складальніка з'яўляецца інтэрпрэтацыя пытанняў узнікнення і функцыянавання гарадоў на беларускіх землях у IX—XVIII стст. Такі падыход дазваляе вучням высветліць працэсы цэласнага развіцця гарадоў і раскрыць заканамернасці гарадской гісторыі. Мэта гэтага артыкула — прапанаваць адукацыйную мадэль вывучэння горада на розных этапах навучання ў VI—VIII класах.

Развіццё гістарычных уяўленняў па праблемах гарадскога жыцця было выклікана існаваннем шэрагу тэорый і канцэпцый генезісу і функцыянавання горада, што не магло не адбіцца на змесце гістарычнай адукацыі ў сярэдняй і вышэйшай школах. Вывучэнне гісторыі горада застаецца важным і актуальным напрамкам даследавання. Пры гэтым тэматыка горада акрэсліваецца ў школьных падручніках, пачынаючы з VI класа. Сярод пытанняў, прысвечаных гэтай праблеме, наступныя: паходжанне назваў гарадоў, прычыны іх узнікнення, развіццё гарадского рамяства і гандлю, занятні гараджан, гарадское самакіраванне; магдэбургскае права, роля гарадоў у грамадскім жыцці, унутраны і знешні гандаль, сацыяльныя канфлікты ў гарадах, з'яўленне мануфактурнай вытворчасці. Аналіз школьнай праграмы дазваляе канстатаваць, што разгляд такой праблемы займае важнае месца ў працэсе навучання і фарміравання гістарычнага светапогляду вучняў.

Навукова-метадычныя аспекты праблем узнікнення і развіцця старажытных гарадоў раней разглядаліся аўтарам артыкула, дзе ён узнімаў такія пытанні, як шляхі і прычыны ўзнікнення гарадскіх пасяленняў; развіццё тэрытарыяльнай структуры гарадоў, гісторыка-археалагічныя прыкметы горада; папярэднікі горада [1]. Для больш глыбокага асэнсавання гэтай праблемы магчыма будзе засяродзіць пазнавальны інтарэс вучняў на навуковых тэзах айчынных гісторыкаў-медыявістаў.

Беларускі гісторык **Э. М. Загарульскі** асноўны свой погляд на праблему ўзнікнення і развіцця гарадоў Беларусі выклаў у працы «Заходняя Русь: IX — XIII стст.». Ідэйным акцэнтам навукоўца ў вырашэнні праблемы паходжання і далейшага развіцця гарадоў стаў яго тэзіс, які патрабуе асаблівай увагі. Так, Э. М. Загарульскі зазначае: «Рэальнасць патрабуе ад нас дапусціць магчымасць перарастання ў горад паселішча іншага тыпу ў выніку колькаснага накаплення ў ім рамесніцка-гандлёвага элемента, што на нейкім этапе змяніў агульную якасную характарыстыку першапачатковага паселішча, зрабіў яго горадам у навуковым сэнсе гэтага слова» [2, с. 150]. Не адмаўляючы ролю рамяства і гандлю ў станаўленні гарадоў, можна пагадзіцца з дадзеным сцвярджэннем. Перад настаўнікам гісторыі адкрываецца навуковае вымярэнне, якое магчыма транслiраваць у адукацыйную плоскасць. Пастаноўка праблемнага пытання на ўроках гісторыі *(Што падштурхоўвала развівацца паселішча і перарастаць яго ў горад?)* дазволіць вучням лепей усвядоміць характар



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version



прычынна-выніковых сувязей і трывала замацаваць свае веды. У сваю чаргу, гэта будзе садзейнічаць і фарміраванню вобразнага мыслення шасцікласнікаў з апорай на наглядпасць (фота гарадзішчаў і гандлёва-рамесных пасадаў гарадоў).

Стаўленне Э. М. Загарульскага да адметнай ролі рамяства і гандлю як важнай магчымасці «да перараджэння паселішчаў у сапраўдны горад» [2, с. 171] не выключае і іншых асноватворных фактараў. Па меркаванні даследчыка, большасць беларускіх гарадоў прайшла праз феадальны (дзяржаўны) шлях утварэння. У аснове — такія феадальныя паселішчы, як крэпасць-замак, ваенна-адміністрацыйны і фінансава-адміністрацыйны цэнтр акругі, феадальная сядзіба. Праблему ўзаемаўплыву гандлёва-рамеснага і дзяржаўнага шляхоў узнікнення гарадоў навуковец вырашае наступным чынам: «Яны (феадальныя паселішчы. — **Аўт.**) валодалі шэрагам пераваг, якія спрыялі назапашванню ў некаторых з іх рамесніцка-гандлёвага элемента» [2, с. 171].



*Малюнак 1* — **Умацаванае паселішча**



*Малюнак 2* — **Гарадскі пасад**

Значны ўнёсак у распрацоўку праблем паходжання і станаўлення беларускіх гарадоў зрабіў беларускі гісторык **Г. В. Штыхаў**, які доўгі час займаўся падрыхтоўкай школьных падручнікаў па гісторыі Беларусі. Так, аўтар зазначае, «Происхождение городов Полоцкой земли может быть представлено следующим образом. Предвестниками древнейших из них были укреплённые пункты славян, возникшие при их расселении на территории Подвинья в IX в. Постепенно укреплённый населённый пункт, обрастая посадскими поселениями, становился центром ремесла и торговли в связи с необходимостью переработки и реализации феодальной ренты» [3, с. 14]. Такое судджэнне заслугоўвае прызнання. Па-першае, за тое, што аўтар вызначыў ступень пераемнасці паміж умацаваным племянным цэнтрам (пунктам) і гандлёва-рамесным пасяленнем. Па-другое, за разуменне навукоўцам прыроды ўзаемаабумоўленасці асноватворных шляхоў паходжання гарадоў.

На падставе аналізу поглядаў Г. В. Штыхава можна вызначыць асноватворную ідэю: «У развіцці генезісных форм (умацаваных паселішчаў, абарончых умацаваных пунктаў, феадальных замкаў, прагарадоў) гарадоў галоўнай умовай выступае геаграфічны (выгаднае размяшчэнне) і сацыяльна-эканамічны фактар (развіццё рамяства і гандлю), якія садзейнічаюць пераўтварэнню паселішча адміністрацыйна-гаспадарчага, ваенна-адміністрацыйнага кшталту ў горад». Для больш эфектыўнага ўсведамлення праблемы папярэднікаў горада магчыма прапанаваць у дапамогу настаўніку гісторыі карту «Гарады і іх папярэднікі на тэрыторыі Беларусі ў IX—XIII стст.». Такая карта дазваляе падлічыць, колькі летапісных гарадоў існавала на той час, што з'яўлялася асновай для горадаўтварэння для кожнага пасялення.

Пазнавальны інтарэс на ўроках гісторыі можа выклікаць праблема паходжання назвы беларускіх гарадоў. У свой час вядомы расійскі гісторык **Л. В. Аляксееў** пераканаўча аргументаваў паходжанне назвы Барысава. Так, даследчык падкрэсліваў, што назва горада паходзіць ад рэчкі Брыса. Аднак у адпаведнасці з канцэпцыяй

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version



В. В. Сядова, гарады, якія заканчваюцца на суфіксы «-ов», «-ев» («-аў», «-еў»), указваюць на патранімічнае паходжанне. Таму назва горада Барысава ўтворана ад імя князя Барыса і суфікса прыналежнасці «-аў». Спрэчным у гістарычнай навуцы з'яўляецца пытанне аб паходжанні назвы Лагойска. Паварот у вывучэнні праблемы яго ўзнікнення намеціўся ў 1970 г., калі вядомы вучоны-мовазнаўца **В. П. Лемцюгова** выказала меркаванне, што на «аснове гідроніма Лагоза ці Лагаза мог узнікнуць айконім Логожескъ (старажытная форма), а затым Лагойск».

У адпаведнасці з меркаваннем В. П. Лемцюговай, у 2003 г. **В. Л. Насевіч** выказаў думку, што «Лагожаск» першапачаткова размяшчаўся на р. Лагазінцы (Лагазе), а затым гэта паселішча магло быць перанесена на больш зручнае месца (на бераг Гайны), захаваўшы старую назву. Не маючы археалагічных даных і знаходзячыся пад уплывам тэорыі «пераносу», даследчык не пакідаў надзею ў пацвярджэнні версіі [4, с. 49].




*Малюнак 3* — **Парныя цэнтры**

У 2004—2007 гг. падчас новых навуковых раскопак археолаг Г. В. Штыхаў высветліў, што ў IX—XI стст. за 7 км ад сучаснага г. Лагойска каля в. Старое Гарадзішча на р. Лагазінцы (Лагазе) існаваў старажытны населены пункт, які меў гарадзішча, тры селішчы і курганны могільнік. Абапіраючыся на тэорыю «парных цэнтраў», гісторык заначае, што «паселішчы на Лагазе і Гайне суіснавалі разам, аднак потым адно паселішча прыйшло канчаткова ў заняпад, а горад на беразе Гайны стаў Лагожскам — цэнтрам воласці, а затым сталіцай асобнага ўдзельнага княства Полацка-Менскай зямлі» [5, с. 121]. Так дзякуючы даследаванням Г. В. Штыхава стала вядома аб існаванні парных цэнтраў на беларускіх землях. Як мы лічым, у гісторыкаў няма канчатковых падстаў для таго, каб сцвярджаць, што насельніцтва на Лагазінцы аказала ўплыў на існаванне цэнтра на Гайне.

Сваёй дыскусійнасцю адрозніваецца і спецыфіка ўяўлення айчынных навукоўцаў аб развіцці гарадоў на землях Беларусі ў часы развітога і позняга феадалізму. Адна з такіх праблем, як роля гарадоў у фарміраванні капіталістычных адносін і разлажэнні феадалізму, атрымала сваё навукова-метадычнае асэнсаванне аўтарам артыкула [6]. Разуменне з'яў і працэсаў, характэрных для гісторыі феадальных гарадоў Беларусі XIV—XVIII стст., патрабуе ўсведамлення сутнасці не толькі гістарычнай



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version



эпохі, але і ўнутранай прыроды феадальнага горада са сваімі заканамернасцямі развіцця. Апошняе немагчыма без шматбаковага і грунтоўнага аналізу прац гісторыкаў, прысвечаных пытанням сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця гарадоў Беларусі ў межах разглядаемага перыяду.

Праблемы сацыяльна-эканамічнай і палітычнай гісторыі гарадоў Беларусі XVI—XVIII стст. знайшлі адлюстраванне ў працах пасляваенных айчынных гісторыкаў 60—80-х гг. XX ст. Шэраг абагульняльных даследаванняў быў прысвечаны характарыстыцы сацыяльна-эканамічнага развіцця беларускіх гарадоў.

Адной з першых абагульняльных прац можна лічыць даследаванне, прысвечанае гісторыі гарадоў Заходняй Беларусі. Так, іх стан і ўзровень развіцця ў першай палове XVII ст. быў разгледжаны ў працы **С. А. Шчарбакова [7]**. Канцэптуальным падыходам можна назваць спробу аўтара даказаць выснову пра пачатак эканамічнага і палітычнага заняпаду беларускіх гарадоў у першай палове XVII ст. Некаторыя суджэнні аўтара не заўсёды адпавядалі рэальным абставінам, у прыватнасці сцвярджэнні аб дамінуючых прычынах заняпаду цэхаў, якія праяўляліся ў знешняй канкурэнцыі. Зазначым, што пранікненне замежных тавараў калі і мела месца, але напятткова абумовіць крызіс цэхавай арганізацыі не магло.

Стан і развіццё гарадоў Беларусі ў XVI—XVII стст. даследаваны ў працы **З. Ю. Капыскага [8]**. Гісторык, падкрэсліваючы тэндэнцыю эканамічнага ўздыму беларускіх гарадоў у гэты час, засяродзіў увагу на крыніцах росту гарадскога насельніцтва, вызначыў яго сацыяльны і нацыянальны склад. Даследчык даў разгорнутую характарыстыку цэхавай арганізацыі. Характарызуючы не стан, а таксама рамесную вытворчасць, З. Ю. Капыскі вызначае асаблівасці развіцця рамяства горада Мінска. Па сутнасці аўтар паўтарыў выснову папярэднікаў аб зараджэнні пракапіталістычных элементаў у нетрах гарадскога рамяства, што, па меркаванні З. Ю. Капыскага, абумовіла падрыхтоўку да эвалюцыі феадальнага горада.

Пытанні сацыяльна-палітычнага развіцця гарадоў Беларусі ў XVI—XVIII стст. разгледжаны ў спецыяльных працах З. Ю. Капыскага, **А. П. Грыцкевіча**, **А. Цітова**. Разглядаючы шматбаковыя аспекты сацыяльна-палітычнай арганізацыі гарадоў Беларусі, З. Ю. Капыскі лічыў, што пераход да магдэбургскага права адыграў станоўчую ролю, нягледзячы на іх палавінчатасць. Па меркаванні даследчыка, у гарадах Беларусі адбываўся працэс прыстасавання запазычаных форм і арганізацыі ўлады адносна асабістых умоў гарадскога жыцця. Гісторыкам паказаны асноўныя напрамкі грамадска-палітычнай барацьбы гарадоў Беларусі, дзейнасць цэхаў, брацтваў і іх роля ў жыцці горада.

Усебаковыя праблемы развіцця беларускіх гарадоў у другой палове XVII—XVIII стст. даследаваны ў працы **А. М. Карпачова [9]**. Гісторык прыйшоў да канцэптуальнай высновы, згодна з якой неспрыяльныя ўмовы развіцця беларускіх гарадоў у разглядаемы час не паўплывалі карэнным чынам на заняпад эканомікі. Сярод пытанняў, разгледжаных аўтарам, важнае месца належыць падліку колькасці гарадоў, высвятленню прававога і эканамічнага становішча гараджан, вызначэнню іх колькаснага, сацыяльнага і нацыянальнага складу. Погляды А. М. Карпачова аб ролі рамеснай вытворчасці гарадоў Беларусі ў зараджэнні капіталістычных адносін не сталі выключэннем. Сцвярджэнне гісторыка аб тым, што рост феадальных юрыдык фактычна не паўплываў на заняпад гарадоў, патрабуе пераасэнсавання. Новыя даныя прыводзіліся пры характарыстыцы асноўных напрамкаў гандлю, суадносін экспарту і імпарту.

Кароткі агляд гістарычных канцэпцый на праблему ўзнікнення і развіцця гарадоў Беларусі ў IX—XVIII стст. дазваляе засяродзіць увагу вучняў на важных заканамернасцях, якія абумоўлівалі характар развіцця гарадоў. Параўноўваючы гэтыя працэсы ў раннефеадальны перыяд (функцыянаванне раннесярэдневяковых гарадоў у IX—XIII стст.) і часы развітога феадалізму (развіццё феадальнага горада ў XIV—XVIII стст.), назавём некаторыя асаблівасці.

Так, галоўнымі фактарамі развіцця гарадскіх паселенняў у IX—XIII стст. былі выгадныя геаграфічныя ўмовы знаходжання паселішча, будаўніцтва ваенна-абарончых цэнтраў; актывізацыя рамёстваў і гандлю, пашырэнне пасадаў, павелічэнне колькасці



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version



гарадскога насельніцтва. На развіццё гарадоў у XIV—XVIII стст. у рознай ступені ўплывалі: геастратэгічнае становішча гарадоў (як спрыяльныя ўмовы для развіцця знешняга і ўнутранага гандлю, так і негатыўны ўплыў іх знаходжання ў віхуры ваенных супрацьстаянняў дзяржаў); зацяжны характар уплыву рамеснай вытворчасці (інтэнсіўнае развіццё рамёстваў у параўнанні з мануфактурамі і фабрыкамі); распаўсюджванне магдэбургскага права, павелічэнне колькасці гарадскога насельніцтва. У працэсе выкладання ўрокаў гісторыі неабходна засяродзіць увагу вучняў на тым, што ў развіцці гарадоў на розных этапах мела месца паўтарэнне некаторых гістарычных з'яў (гістарычная заканамернасць).

Падсумоўваючы, зазначым, што выкарыстанне прапануемых навуковых матэрыялаў на ўроках гісторыі з улікам узроставых асаблівасцей вучняў дазволіць пашырыць іх уяўленні пра характар гарадскога развіцця і актывізаваць пазнавальную цікавасць. Распрацоўка гэтай адукацыйнай мадэлі выклікана таксама неабходнасцю трансляцыі навуковых дасягненняў у змест гістарычнай адукацыі сярэдняй школы ва ўмовах існавання інфармацыйнага грамадства. Матэрыялы артыкула могуць быць карыснымі для фарміравання вопыту працы вучняў з элементамі навуковай інфармацыі. У сваю чаргу, асэнсаванне праблематыкі развіцця гарадоў Беларусі будзе садзейнічаць фарміраванню каштоўнасных пазіцый да мінулага грамадства, замацаванню патрыятычных пазіцый вучняў.

### Практычныя рознаўзроўневыя заданні

***I узровень***

Прапануйце назву гістарычнай з'явы.

1-ы варыянт



2-і варыянт



***II узровень***

1-ы варыянт. Растлумачце значэнне гістарычных паняццяў: *горад, геаграфічны фактар утварэння горада.*

2-і варыянт. Растлумачце значэнне гістарычных паняццяў: *магдэбургскае права, сацыяльна-эканамічны фактар утварэння горада.*

***III узровень***

1-ы варыянт. Вызначце ўзаемасувязь наступных гістарычных паняццяў: *умацаванае паселішча ⟷ гандлёва-рамесны пасад.*

2-і варыянт. Вызначце ўзаемасувязь наступных гістарычных паняццяў: *рамяство ⟷ горад.*

***IV узровень***

1-ы варыянт. Вызначце і ахарактарызуйце асаблівасці развіцця раннефеадальнага горада.

2-і варыянт. Вызначце і ахарактарызуйце асаблівасці развіцця гарадоў Беларусі ў XIV—XVIII стст.

***V узровень***

1-ы варыянт. Параўнайце паміж сабой погляды Э. М. Загарульскага і Г. В. Штыхава на праблему ўзнікнення гарадоў.

2-і варыянт. Беларускія гісторыкі З. Ю. Капыскі, А. М. Карпачоў, А. П. Ігнаценка, аналізуючы рамесную вытворчасць, імкнуліся перабольшыць яе ролю ў зараджэнні капіталістычных адносін. Ці можна пагадзіцца з іх меркаваннямі? Свой адказ абгрунтуйце.



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version



### Спіс выкарыстаных і цытаваных крыніц

1. *Врублеўскі, Ю. У.* Узнікненне старажытных гарадоў на беларускіх землях у IX—XIII стагоддзях / Ю. У. Врублеўскі // Гісторыя і грамадазнаўства. — 2015. — № 12. — С. 13—17.

2. *Загарульскі, Э. М.* Заходняя Русь, IX—XIII стст. : вучэб. дапам. для студэнтаў гіст. фак. ВНУ / Э. М. Загарульскі. — Мінск : Універсітэцкае, 1998. — 240 с.

3. *Штыхов, Г. В.* Города Полоцкой земли (IX—XIII вв.) / Г. В. Штыхов. — Минск : Навука і тэхніка, 1978. — 159 с.

4. *Насевіч, В.* Старонкі мінулага Лагойшчыны / В. Насевіч // Памяць : Лагойскі раён : гіст.-дак. хронікі гарадоў і р-наў Беларусі : у 2 кн.; рэдкал. : Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш]. — Мінск : БелЭН, 2003. — Кн. 1. — С. 49—50.

5. *Штыхаў, Г. В.* Археалагі дапаўняюць летапісцаў / Г. В. Штыхаў. — Мінск : Беларус. навука, 2009. — 148 с.

6. *Врублеўскі, Ю. У.* Роля гарадоў Беларусі ў фарміраванні капіталістычных адносін і разлажэнні феадалізму / Ю. У. Врублеўскі // Гісторыя і грамадазнаўства. — 2016. — № 11. — С. 3—6.

7. *Щербаков, С. А.* Города Западной Белоруссии в составе Речи Посполитой в первой половине XVII века : автореф. дис. ... канд. ист. наук / С. А. Щербаков. — Львов, 1958. — 20 с.

8. *Копысский, З. Ю.* Экономическое развитие городов Белоруссии в XVI — первой половине XVII в. / З. Ю. Копысский. — Минск : Навука і тэхніка, 1966. — 227 с.

9. *Карпачёв, А. М.* Социально-экономическое развитие городов Белоруссии во второй половине XVII — XVIII в. : автореф. дис. ... д-ра ист. наук: 07.00.02 / А. М. Карпачёв. — Минск, 1970. — 56 с.

### Из античной мудрости*

**Ab áltero (álio) exspéctes, álteri quod féceris.**
Жди от другого того, что ты сам ему сделал.

*Публилий Сир*

**Acceptíssima semper múnera sunt, auctor quae pretiósa facit.**
Самые приятные те дары, которые приносит дорогой тебе человек.

*Овидий*

**Accípere quam fácere praestat injúriam.**
Лучше терпеть самому, нежели беду сделать кому.

*Цицерон*

---

* **Из античной мудрости:** Латинские пословицы и поговорки с русскими соответствиями / авт.-сост. Н. А. Гончарова. — Минск : Вышэйшая шк., 2004. — 495 с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version